УДК 821.161.3-1

**_С.М. Тарасава_**
*магістр філал. навук, ст. выкладчык каф. беларускай філалогіі*
*Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы*
e-mail: mail@grsu.by

# ПРАБЛЕМА ТЫПАЛОГІІ ПАЭМЫ Ў ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ І КРЫТЫЦЫ

*Разглядаецца жанралогія паэмы ў рэчышчы яе тэарэтычнага вывучэння замежнымі і айчыннымі літаратуразнаўцамі і крытыкамі. Устаноўлена, што паэма вызначаецца шэрагам устойлівых жанравых адзнак і ў той жа час з'яўляецца жанрам зменлівым, дынамічным. Пытанні вывучэння спецыфікі паэмы як літаратурнага жанру і распрацоўкі яе тыпалогіі застаюцца актуальнымі ў сучасным літаратуразнаўстве.*

Прызнаючы, што асноўныя заканамернасці гісторыка-літаратурнага развіцця знаходзяцца ў цесных суадносінах з жанравай сістэмай слоўнага мастацтва, можна сцвярджаць, што без рашэння жанравых праблем складана раскрыць сутнасць і спецыфіку літаратурнага працэсу. Пры гэтым большасць даследчыкаў лічыць, што, не ведаючы законаў жанру, нельга ацаніць вартасць мастацкага твора і майстэрства самога пісьменніка. Невыпадкова філалагічнай навукай мінулага і сучаснасці актыўна распрацоўваюцца праблемы літаратурных жанраў, і складваецца адпаведная галіна літаратуразнаўства – жанралогія.

Названыя праблемы застаюцца актуальнымі, бо літаратура XX і XXI стст. прадставіла ўзоры самых розных жанраў і выявіла магчымасці іх узаемадзеяння. Праблеме тыпалогіі жанру прысвяцілі свае напрацоўкі Г. Гегель, А. Весялоўскі, прадстаўнікі фармальнай школы (у прыватнасці, Ю.Тынянаў). У распрацоўку тэорыі жанраў значны ўклад зрабіў М. Бахцін, які ў пачатку XX ст. распрацаваў сваю жанравую канцэпцыю. Праца ў вызначаным рэчышчы працягвалася такімі расійскімі літаратуразнаўцамі, як Г. Паспелаў, В. Кожынаў. На сучасным этапе праблемы жанру разглядаліся ў шэрагу прац вядомых навукоўцаў, у тым ліку В. Проніна «Тэорыя літаратурных жанраў» (2001), Н. Лейдэрмана «Тэорыя жанру» (2010). Грунтоўна асвятляецца праблема жанраўтварэння ў працах Н. Тамарчанкі, В. Цюпы, С. Бройтмана «Тэорыя літаратуры» (2004), а таксама ў вучэбным дапаможніку «Тэорыя літаратурных жанраў» (2012) пад агульнай рэдакцыяй Н. Тамарчанкі.

Згаданыя даследчыкі на аб'ёмным літаратурным матэрыяле прапануюць жанравыя тыпалогіі, якія ілюструюць дынаміку самых розных жанраў, асабліва тых, у якіх найбольш яскрава адбіваюцца сутнасныя культурна-эстэтычныя з'явы эпохі, праяўляюцца асаблівасці паэтыкі і эстэтыкі.

## Паэма як літаратурна-мастацкі жанр

У ліку жанраў, што пастаянна развіваюцца, узаемадзейнічаюць з іншымі і прызнана застаюцца ўнікальнай, складанай мастацкай з'явай, застаецца паэма. Гэты жанр справядліва лічыцца важнай часткай літаратурнага працэсу розных эпох і часоў. Многія высновы вышэйназваных даследчыкаў маюць бясспрэчнае значэнне для разумення заканамернасцей функцыянавання твораў паэмнага жанру. Паэма здаўна вылучалася сваім асаблівым характарам і спосабам выяўлення рэчаіснасці. Яна прызнана жанрам неардынарным, нестандартным, дынамічным, што і выклікае з'яўленне ў шэрагу навукоўцаў дастаткова спрэчных і часам катэгарычных пазіцый.

Нягледзячы на важнасць і функцыянальную запатрабаванасць, у нацыянальным літаратуразнаўстве яшчэ няма сучасных сістэмных даследаванняў па жанралогіі бела-

рускай паэмы. І хаця праблемы тыпалогіі, генезісу і гісторыі закраналіся ў асобных працах беларускіх літаратуразнаўцаў, многія пытанні застаюцца нявырашанымі, асабліва тыя, што датычацца сучаснага стану паэмы, беларускай паэмы другой паловы ХХ – пачатку ХХІ ст.

Пачаткам тэарэтычнага даследавання паэмы прынята лічыць ХІХ ст., калі з'явіліся крытычныя працы В. Бялінскага, прысвечаныя рускай літаратуры. Ён упершыню згадвае пазнавальныя адзнакі новага жанру – паэмы («Раздзяленне паэзіі на роды і віды» і інш.). Бялінскі адзначыў працэс знікнення старых і з'яўленне новых жанраў у рэчышчы тагачаснай паэмы. Аднак пазіцыя В. Бялінскага была не ў поўнай меры прынята пазнейшымі навукоўцамі.

Думаецца, наяўнасць шырокага круга спрэчных пытанняў вынікае з нявызначанасці самога тэрміну «паэма», якому ў аўтарытэтных літаратуразнаўчых даведніках і слоўніках даюцца дастаткова розныя тлумачэнні. Адметнае азначэнне паэмы падавала адно са старэйшых рускіх даведачных выданняў [9]. Тут дастаткова падрабязна разглядаецца гісторыя паэмы, указваюцца яе вытокі і характэрныя адзнакі. Аднак у згаданым выданні паэма так і не вызначаецца як асобны літаратурны жанр. Толькі згадваючы набыткі літаратуры ХІХ ст., указваецца, што «паэма зараз прымае від то кароткага, то вялікага вершаванага аповеду аб падзеях з асабістага жыцця выдуманай асобы, не падпарадкаванага ніякім звычайным правілам паэмы, са шматлікімі адступленнямі лірычнага характару, са зваротам галоўнай увагі на прыватнае жыццё героя. Хутка паэма губляе свой рамантычны характар і ў сувязі з агульнай зменай літаратурных тэарэтычных установак атрымлівае новае значэнне ліра-эпічнай паэмы як асобнага віду мастацкага твора, класіцызм якога праяўляецца поўнай апраўданасцю твора ў адпаведнасці з народнымі асаблівасцямі (духу народнаму) і патрабаванням мастацкасці» [9, с. 629].

Аўтары артыкулаў аб паэме кожнага з наступных літаратуразнаўчых даведачных выданняў (Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / рэд.-склад. Л. Цімафееў, С. Тураеў (1974); Літаратурны энцыклапедычны слоўнік / пад агул. рэд. В. Кажэўнікава, П. Нікалаева (1987)) будуць уносіць свае карэктывы ў азначэнні тэрміну «паэма», улічыўшы тыя змены, што адбыліся ў рэчышчы названага жанру за пройдзены перыяд. У выніку навукоўцамі канстатуецца думка, што паэма – гэта сінтэтычнае жанравае ўтварэнне. Імі згадваецца і манументальнасць жанру, што, відавочна, абумоўлена аўтарскім пафасам. Але ў даведачных выданнях ХХ ст. праблема класіфікацыі паэмы не знайшла свайго непасрэднага адлюстравання. Назіранні даследчыкаў грунтуюцца на аб'ёмным літаратурным матэрыяле, і ў той жа час ім не хапае дакладна вызначаных характэрных адзнак жанра. Прыведзеныя імі жанравыя характарыстыкі паэмы не дазваляюць правесці дакладных межаў паміж паэмай і вершаваным апавяданнем, раманам у вершах або лірычным цыклам. Таму застаецца актуальнай праблема вылучэння канкрэтных рысаў жанру паэмы. А гэта, думаецца, магчыма толькі пры дэталёвым і параўнальным вывучэнні функцыянавання названага жанру ў розныя перыяды і эпохі.

Варта прызнаць, што літаратуразнаўства ХХ ст. зрабіла значны крок у напрамку вывучэння паэмы як жанру, пра што сведчаць шматлікія даследаванні, прадстаўленыя навукоўцамі розных краін. Гісторыі, ідэйна-эстэтычнаму боку твораў у жанры паэмы прысвечаны працы рускіх даследчыкаў, што з'явіліся ў 1960–70-я гг., такіх як А. Беразнева, А. Банкетаў, М. Зубкоў, А. Лур'е, Г. Чарвячэнка і інш. Увагу да жанру паэмы і яе эвалюцыі ва ўкраінскай літаратуры праявілі В. Іванісенка, П. Сярдзюк, М. Гнацюк, А. Каспрук. На старонках «Литературной газеты», часопісаў «Вопросы литературы», «Дружба народов», «Литературное обозрение» ў 1960-я гг. ішлі дыскусіі, прысвечаныя паэме і перспектывам гэтага жанру: што ж такое жанр паэмы і якія яе спецыфічныя рысы. Адны бачылі іх у драматызме, іншыя – у змястоўнай насычанасці, трэція – у асаблівай форме эмацыйнага і г.д. Меркаванні ўдзельнікаў дыскусіі былі рознымі

ў вызначэнні крытэрыяў азначэння жанру, які тлумачыўся то залішне шырока, то, наадварот, звужана: часцей за ўсё абсалютызаваўся адзін родавы элемент – эпічны або лірычны. Навуковыя дыскусіі гэтага часу хоць і абудзілі цікавасць да вывучэння жанру, але так і не вырашылі спрэчных пытанняў.

Заканамерна і натуральна выглядае з'яўленне новых даследаванняў, прысвечаных паэме ў 1980-я гг. Так, тэарэтычныя аспекты паэмы разглядаліся ў працах расійскіх даследчыкаў А. Жакава, С. Каваленкі, В. Рэдзькіна і інш. Істотным крокам у даследаваннях 1980–90-х гг. было вылучэнне літаратуразнаўцамі розных жанравых разнавіднасцей паэмы і прызнанне лірычнай паэмы як аднаго з найбольш пашыраных яе варыянтаў у творчасці пісьменнікаў. Менавіта ў 1980–90-я гг. да выданняў рускіх даследчыкаў паэмы далучыліся набыткі навукоўцаў, што распачалі даследаванні жанру паэмы ў сваіх нацыянальных літаратурах. Натуральна, што многімі з іх быў выкарыстаны навуковы вопыт вучоных-папярэднікаў. Ва ўкраінскім літаратуразнаўстве паэма стала аб'ектам даследавання ў працах Н. Мазепы «Развіццё сучаснай савецкай паэмы» (1986), Л. Скірды «Грамадзянскасць сучаснай украінскай паэмы» (1986), у якіх разглядаецца ідэйна-тэматычны абсяг твораў рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў. Жанравы аспект паэмы аказаўся ў полі ўвагі Б. Мельнічука, Л. Дем'яніўскай, якія даследавалі функцыянаванне і стан драматычнай паэмы ў творчасці ўкраінскіх пісьменнікаў.

Свой погляд на спецыфіку паэмнага жанру выявіў В. Кіканса ў працы «Сучасная савецкая паэма» (Рыга, 1982). Даследчык, абапіраючыся на вопыт розных нацыянальных літаратур, вызначае, што паэма з'яўляецца не жанрам, а відам з шэрагам пазнавальных адзнак. А ў кнізе літоўскага даследчыка Р. Пакальнішкіса «Літоўская паэма. Асноўныя жанравыя формы» (Вільнюс, 1987) па-іншаму тлумачыцца генезіс паэмы: аўтар звязвае сутнасць паэмы як самастойнага жанру з узаемадзеяннем розных родавых пачаткаў, іх сінтэзам.

На рубяжы XX–XXI стагоддзяў з'яўляюцца новыя навуковыя працы, якія даследуюць паэмную творчасць знакавых пісьменнікаў свайго часу, разглядаюць жанр паэмы ў гісторыка-тыпалагічным плане, вызначаюць шляхі развіцця паэмы ў яе мастацкіх і жанрава-стылёвых асаблівасцях. Жанравую спецыфіку рускай паэмы 1950–80-х гг. разглядае В. Рэдзькін у манаграфіі «Руская поэма 1950–1980 гг. Жанр. Паэтыка. Традыцыі» (2000). Падсумаваннем гісторыі вывучэння жанру паэмы з'яўляюцца даследаванні Л. Спясіўцавай, у прыватнасці яе манаграфія «Жанр лірычнай паэмы ў рускай літаратуры першай трэці XX ст.» (2006). А ў яе артыкуле «Паэма як літаратурны жанр» прасочваюцца этапы трансфармацыі жанру паэмы і вызначаецца ступень вывучанасці праблемы ў літаратуразнаўстве XX ст. На думку даследчыцы, паэма па-ранейшаму застаецца «непрадказальнай» у жанравых адносінах. Тым не менш для вырашэння праблемы тыпалогіі жанру, мяркуе навуковец, патрабуецца навукова лагічны шлях даследавання: «Пазбегнуць змешвання тыпалагічных прынцыпаў магчыма толькі пры даследаванні паэмы з пункту гледжання яе міжродовых і міжжанравых узаемадзеянняў. Важна вызначыць, што спрыяе захаванню адных жанравых прыкмет і трансфармацыі іншых, як адлюстроўваюцца ў разнавіднасці паэмы міжжанравыя ўзаемадзеянні. Пры гэтым неабходна ўлічваць гістарычна канкрэтную жанравую сітуацыю, без якой немагчыма выявіць тэндэнцыі ўнутрыжанравай змены паэмы і растлумачыць, чаму адны яе прыкметы ў дадзены гістарычны перыяд становяцца жанраўтваральнымі, іншыя аказваюцца на перыферыі, лёгка падвяргаючыся змешванню, функцыянальнаму вар'іраванню» [11, с. 156].

Па сцвярджэнні ўкраінскага даследчыка паэмы А. Прысяжнюк, з'ява міжродавага і міжжанравага ўзаемадзеяння арыгінальна выяўляецца ў творах паэмнага жанру ўкраінскіх пісьменнікаў. У дысертацыйным даследаванні, прысвечаным творчасці вядомага ўкраінскага пісьменніка Дзмітрыя Паўлычкі, яна зазначае: «Найноўшая паэма – якасна новая з'ява, абумоўленая наватарскім характарам літаратуры сярэдзіны XX ста-

годдзя. Сінтэз традыцыйнага і індывідуальна-аўтарскага – яе галоўны жанравы “паказчык”. Унікальныя мадэлі свету ў ёй дасягаюцца дзякуючы сінтэтычнасці – уз’яднання перш эпасу і лірыкі. Рэалізуецца ў жанры паэмы і катэгорыя драматычнага» [10, с. 8].

Праведзены аналіз даследаванняў па праблеме дэфініцыі паэмы дае падставы для высновы, што паэму варта разглядаць як асобы сінтэтычны жанр, своеасаблівую сістэму, якая складаецца з мастацка-літаратурных пластоў, што дынамічна ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, развіваюцца і ўскладняюцца.

**Гісторыя беларускай паэмы ў даследаваннях айчынных літаратуразнаўцаў**

Даследаванне гісторыі беларускай паэмы, яе жанравай структуры, асаблівасцей паэтыкі – адзін з важных аспектаў у асэнсавання набыткаў айчыннага мастацтва слова. Паэмы беларускіх аўтараў надавалі літаратуры глыбока нацыянальны характар, увасобілі самабытнае аблічча народа і народнага характару.

Айчынныя даследчыкі здаўна разглядалі гісторыю беларускай паэмы ў агульнасусветным літаратурным кантэксце. Так, М. Лазарук адзначае: «Паэма як жанр мае вялікую гісторыю. Яна прайшла ў сваім развіцці некалькі этапаў, якім адпавядаюць розныя тыпы твораў гэтага жанру. Самым раннім этапам быў перыяд, які даў паэму-эпапею, або эпічную паэму (“Іліяда” і “Адысея” Гамера, “Энеіда” Вергілія, “Боская камедыя” Дантэ і інш.). Вялікага росквіту паэма як жанр дасягнула ў эпоху рамантызму. У гэты час узнікае рамантычная ліра-эпічная паэма, прадстаўленая такімі выдатнымі ўзорамі, як “Дон Жуан”, “Чайльд Гарольд” Дж. Байрана, “Цыганы”, “Бахчысарайскі фантан” А. Пушкіна, “Дэман”, “Мцыры” М. Лермантава і інш. У беларускай літаратуры, праўда, значна пазней, творы такога тыпу з’явіліся ў Янкі Купалы (“Курган”, “Бандароўна”, “Магіла льва”)» [8, с. 111–112]. У манаграфіі «Станаўленне беларускай паэмы (Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX стагоддзя)» (1968) М. Лазарук асэнсоўвае гісторыю ўласна беларускай паэмы, пачынаючы з так званых ананімных паэм «Энеіда навыварат»і «Тарас на Пранасе». Аднак больш познія даследаванні літаратуразнаўцаў дазволілі значна адкарэктаваць перыяды развіцця беларускай паэмы, дапоўніць іх новымі творамі, што па шэрагу прычын не былі ўлічаны як здабыткі беларускага паэмнага жанру.

Такім чынам, узнікае неабходнасць у пераглядзе перыядаў развіцця жанру паэмы. Лічым мэтазгодным вылучыць у беларускай літаратуры некалькі знакавых этапаў, у кожным з якіх выяўляюцца пэўныя тэндэнцыі і ўласцівасці жанру паэмы, адбываецца станаўленне яе нацыянальнай самабытнасці:

*1 этап.* ***Станаўленне жанру паэмы*** (эпоха ранняга Рэнесансу): паэмы «Песня пра зубра» М. Гусоўскага, «Пруская вайна» Я. Вісліцкага.

*2 этап.* ***Росквіт беларускай лацінамоўнай паэмы*** (канец XVI – першая палова XVII ст.): паэмы Я. Радвана «Радзівіліяда», Х. Завішы «Караламахія».

*3 этап.* ***Актывізацыя мастацкіх пошукаў у жанры паэмы*** (XIX ст.): сатырычныя паэмы, паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча.

*4 этап.* ***Пошук новых жанравых форм*** (пачатак XX ст. ): паэмы Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча.

*5 этап.* ***Ускладненне жанравай прыроды паэмы*** (1920–30-я гг.): паэмы Я. Коласа, У. Дубоўкі, Я. Пушчы, М. Чарота.

*6 этап.* ***Адраджэнне жанру гераічнай паэмы*** (1940–50-я гг.): паэмы П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка.

*7 этап.* ***Узбагачэнне ідэйна-тэматычнага зместу і філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці*** (60 – першая палова 80-х гг. XX ст. ): паэмы А. Куляшова, В. Зуёнка.

*8 этап.* ***Дыфузія жанравых форм*** (канец XX – пачатак XXI ст.): паэмы А. Разанава, Э. Акуліна, В. Жыбуля.

Першыя крытычныя ацэнкі беларускай паэмы з'явіліся ўжо ў XIX ст. у запісах беларускага і польскага літаратуразнаўцы Р. Друцкага-Падбярэзскага. Пры аглядзе беларускай літаратуры ў прадмове да першага тома «Шляхціца Завальні» Я. Баршчэўскага (1844) ім згадваецца і паэма «Энеіда навыварат»: «Гэта чыста народная беларуская паэма па духу і форме» [2, с. 74].

Творы паэмнага жанру закранае ў сваіх літаратуразнаўчых працах вядомы гісторык, фальклярыст і літаратуразнавец М. Доўнар-Запольскі. Ён падрабязна разглядае пытанне аб аўтарстве яшчэ адной сатырычнай паэмы XIX ст. (В. Дунін-Марцынкевіч і паэма «Тарас на Парнасе». Нарыс з гісторыі беларускай этнаграфіі, 1896). Ён жа дае тлумачэнне ідэйна-эстэтычнага зместу некаторых вершаваных твораў В. Дуніна-Марцінкевіча («"Гапон" – аповесць у вершах на беларускай мове В. Дуніна-Марцынкевіча», 1889), якія сам пісьменнік ужо абазначае як паэмы. М. Доўнар-Запольскі і далей будзе даследаваць эстэтычныя і мастацкія асаблівасці твораў паэмнага жанру ў творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Купалы на фоне агульнага літаратурнага працэсу (раздзелы «Зараджэнне літаратуры на беларускай мове», «Грамадскі настрой літаратуры эпохі Адраджэння» і інш. у кнізе «Гісторыя Беларусі»).

Гісторыя напісання і аўтарства паэмы «Энеіда навыварат» знайшла адлюстраванне ў працы акадэміка Я. Карскага «Беларуская "Энеіда навыварат". З прыкладаннем тэксту захаваных урыўкаў» (Харкаў, 1908). Названымі даследаваннямі была закладзена аснова гісторыка-літаратурнага вывучэння жанру паэмы ў беларускай літаратуры.

Свой уклад у даследаванне жанру ўнеслі тыя літаратуразнаўцы, што звярнуліся да вызначэння мастацкіх адзнак паэм Янкі Купалы і Якуба Коласа. Пачатак быў пакладзены на старонках газеты «Наша ніва» ў 1910 г., дзе на паэму «Адвечная песня» з'явілася рэцэнзія У. Самойлы «Адвечная песня Янкі Купалы». У 1920–30-я гг. новым паэмам Я. Купалы прысвячаюцца артыкулы А. Навіны, П. Галавача, Я. Шарахоўскага. У артыкуле А. Вазнясенскага «Паэмы Я. Купалы: Сюжэтная пабудова і стыль» (1927) не толькі грунтоўна аналізуюцца мастацкія асаблівасці твораў пісьменніка, але і ўказваецца дамінуючая роля паэмы сярод тагачасных літаратурных жанраў.

Значным укладам у даследаванне твораў паэмнага жанру сталі артыкулы «Пуціны беларускай літаратуры. Якуб Колас "Новая зямля"» (1924), «Паэма Якуба Коласа "Сымон-музыка" як аўтахарактарыстыка» (1926) І. Замоціна; «Паэма "Сымон-музыка" Якуба Коласа» (1927) А. Бабарэкі; «Паэма "Новая зямля" як манументальны твор у беларускай паэзіі» (1929) М. Байкова; «Паэмы вялікай мастацкай сілы: пра "Новую зямлю" і "Сымона-музыку" Якуба Коласа» (1939) М. Ларчанкі. У названых працах беларускіх навукоўцаў упершыню быў прадстаўлены поўны аналіз паэм, разгледжана гісторыя іх стварэння і сюжэтна-кампазіцыйная будова, адзначана наяўнасць у творах рысаў класічнай эпапеі.

Згадваючы набыткі беларускай паэмы першай трэці XX ст., нельга абысці ўвагай творчасць прадстаўнікоў новага пакалення беларускіх пісьменнікаў – «маладнякоўцаў» і «ўзвышэнцаў», сярод якіх вылучыліся постаці М. Чарота, У. Дубоўкі, Я. Пушчы, П. Шукайлы і інш. Беларуская паэма перадваеннага часу зарэкамендавала сябе як з'ява наватарская, эксперыментальная. На жаль, грунтоўных даследаванняў жанравых адзнак паэмы ў 1920–30-х гг. не з'явілася. Крытыка аператыўна рэагавала на выхад новых паэм беларускіх аўтараў, але перавага ў артыкулах і рэцэнзіях аддавалася аналізу ідэйна-мастацкіх асблівасцей твораў. Асаблівую ўвагу даследчыкі праявілі да паэмы «Босыя на вогнішчы» М. Чарота. Ацэнку твору, часта з ідэалагічных, класавых пазіцый, давалі ў сваіх рэцэнзіях З. Жылуновіч, У. Ігнатоўскі, Я. Бранштэйн, М. Байкоў. Да пытанняў жанравай спецыфікі паэм згаданых вышэй аўтараў літаратуразнаўцы звярнуліся значна пазней.

Даследаванні В. Барысенкі, М. Ларчанкі 1950-х гг., прысвечаныя праблемам станаўлення рэалістычнай плыні ў беларускай літаратуры, не абмінулі твораў паэмнага жанру Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны. Літаратуразнаўцы вызначаюць ролю, якую адыграла паэма ў станаўленні рэалістычнай літаратуры, закранаюць і пытанні, звязаныя з жанравай прыродай твораў, але не на глыбокім тэарэтычным узроўні.

І ўсё ж грунтоўны тэарэтыка-літаратуразнаўчы аналіз жанравых асаблівасцей беларускай паэмы пачаўся менавіта ў 1950-я гг. У 1954 г. у Акадэміі навук БССР была абаронена першая кандыдацкая дысертацыя па даследаванні твораў паэмнага жанру «Ля вытокаў рэалізму беларускай літаратуры XIX ст. (“Энеіда навыварат”, “Тарас на Пар-насе”)». Аўтар даследавання І. Бас не толькі вызначаў ролю беларускіх сатырычных паэм XIX ст. у станаўленні рэалістычнай плыні літаратуры таго часу, але закранаў і пытанне пра іх аўтарства.

Дзесяцігоддзем пазней з’явілася навуковая праца М. Мушынскага «Творчая гісторыя паэм Якуба Коласа “Новая зямля”, “Сымон-музыка”» (1963). Падсумаваўшы вопыт даследчыкаў-папярэднікаў, М. Мушынскі яшчэ раз звяртаўся да гісторыі стварэння класічных твораў беларускай літаратуры. Гэтым жа годам пазначаецца з’яўленне кандыдацкага даследавання Л. Смальянавай «Паэмы Аркадзя Куляшова». У рабоце дадзена ацэнка набыткам прызнанага майстра паэмнага жанру ў 30–60 гг. XX ст., разглядаюцца яго паэмы розных перыядаў, даследуюцца іх мастацкія асаблівасці.

Першай манаграфіяй, прысвечанай уласна жанру паэмы, з’яўляецца кніга М. Лазарука «Станаўленне беларускай паэмы (Жанр паэмы і некаторыя асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў першай палавіне XIX стагоддзя)» (1968). Даследчык разглядае шляхі развіцця беларускай паэмы на шырокім гісторыка-літаратурным фоне, аналізуе ўплыў рускай і польскай літаратур, прасочвае некаторыя эстэтычныя і мастацка-стылёвыя лініі, якія датычацца непасрэдна развіцця жанру паэмы.

Працягам гэтай працы стала другая манаграфія М. Лазарука «Беларуская паэма ў другой палавіне Х1Х – пачатку ХХ ст.» [7], якая ўзнікла на аснове доктарскай дысертацыі «Беларуская паэма ў XIX – пачатку XX ст.: станаўленне жанра» (1969) – першай у беларускай літаратуры, прысвечанай жанру паэмы. На фоне літаратурнага жыцця згаданага перыяду даследчык разглядае рэалістычны (Ф. Багушэвіч, Я. Лучына) і рамантычны (Я. Купала) напрамкі развіцця паэмнага жанру. Зазначаецца іх творчая пераемнасць і арыентацыя на лепшыя здабыткі жанру паэмы ў іншых літаратурах. Паводле М. Лазарука, «катэгорыяй, якая найшырэй выяўляе эстэтычную прыроду паэмы, з’яўляецца патэтычнае… як канцэнтраванае выяўленне велічы чалавечага духу, вышыні інтарэсаў, імкненняў, помыслаў, інтэнсіўнасці духоўнага жыцця. Паэма – жанр эпіка-патэтычны, бо эпічнаму заўсёды ўласціва пэўная велічнасць, манументальнасць» [7, с. 12].

Свой навуковы пошук у жанры паэмы прадоўжыла Л. Смальянава, выдаўшы кнігу «Шляхі паэтычнага эпасу: з гісторыі беларускай савецкай паэмы» (1977), дзе таксама закранаецца пытанне ўзнікнення жанру і разглядаюцца новыя этапы яго развіцця. Даследчыца звярнула ўвагу на знакавыя творы беларускіх аўтараў паслякастрычніцкага перыяду (1920–30-я гг., ваенны перыяд, творы пасляваеннага часу). Аўтар абапіраецца на вялікі фактычны матэрыял (ад твораў Я. Купалы, Я. Коласа да паэм В. Зуёнка, А. Вярцінскага 1960–70-х гг.), дэталёва разглядае мастацкія асаблівасці твораў паэмнага жанру беларускіх пісьменнікаў, называе вядучыя тэндэнцыі ў яго станаўленні. Аднак пытанню жанравай прыроды паэм Л. Смальянава не ўдзяліла значнай увагі, не закранула пытання тыпалогіі жанру: яна не ставіла мэты паглыбіцца ў фармальныя адзнакі твораў. Даследчыца робіць акцэнт на тэматычна-праблемных адзнаках твораў, многія з якіх разглядаюцца цалкам у рэчышчы тагачасных агульнапрынятых ідэйных установак. Аднак знакавасць работы бачыцца ў звароце аўтара да новага матэрыялу, які яшчэ не быў аб’ектам навуковага даследавання ў раней выдадзеных працах М. Лазарука.

Несумненна этапным навуковым даследаваннем стала праца М. Арочкі «Беларуская савецкая паэма» [1]. У ёй разглядаюцца заканамернасці і адметныя рысы беларускай паэмы ад паслярэвалюцыйных гадоў да канца 1970-х. Аўтар закранае і пытанне жанравай прыроды паэмы, ацэньвае здабыткі гэтага жанру ў кантэксце нацыянальнай і сусветнай літаратур. Паводле пазіцыі М. Арочкі, «паэма ўяўляецца буйным паэтычным творам, унутраную прыроду якога вызначаюць з жанравага боку новы стан эпічнага, які праяўляецца ў трох пашыраных формах – падзейна-аб’ектывізаванай, ліра-маналагічнай, драматычна-дыялогавай, а таксама ў іх узаемаперапляценнях; з эстэтычнага боку – узвышанае, якое праяўляе сутнасць чалавечага духу ў вызначальныя нацыянальныя і агульначалавечыя моманты гісторыі; з боку паэтыкі – паэтычнае бачанне праблем веку і спраў чалавека, маштабнае абагульненне сацыяльных, маральна-этычных пытанняў жыцця ў патоку гістарычнага часу» [1, с. 329]. «Лірычнае ў паэме набывае сапраўдную эпічную шырыню сувымярэння з часам» [1, с. 327]. Манаграфія, а пазней і доктарская дысертацыя М. Арочкі «Беларуская савецкая паэма: заканамернасці станаўлення і развіцця» сталі важным укладам у распрацоўку пытання жанравай прыроды паэмы ХХ ст.

Даследчыкі жанру паэмы стварылі дастаткова поўную карціну ўзнікнення і эвалюцыі паэмы ў беларускай літаратуры, прааналізавалі ролю паэм Я. Купалы, Я. Коласа, У. Дубоўкі, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова ў ідэйна-эстэтычным узбагачэнні паэмнага жанру. У той жа час навукоўцы разглядалі беларускую паэму ў аспекце эстэтычнага падабенства з творамі іншых літаратур («Аркадзь Куляшоў як перакладчык украінскай “Енеіди”» П. Ахрыменкі (1973); «Куляшоў і Твардоўскі» Р. Бярозкіна (1976)), рабілі спробы выявіць ідэйна-мастацкія асаблівасці шэрагу беларускіх паэм, прасачыць пераемнасць нацыянальна-эпічных традыцый.

У 1960–70-я гг. паэмам беларускіх аўтараў прысвяцілі артыкулы А. Лойка («Паэма шукае»), М. Барсток («Паэма»), дзе пераважаў тэматычны агляд твораў беларускіх аўтараў, што з’явіліся на дадзеным этапе.

Беларуская літаратура 1980–90-х гг. прадставіла дастатковую колькасць новых ідэйна і мастацка знакавых твораў паэмнага жанру, што выклікала патрэбу ў іх крытычным асэнсаванні. Навукоўцы маладзейшага пакалення Т. Чабан («Мара пра эпас», 1990), Г. Харошка («Трагедыя вайны ў беларускай драматычнай паэме», 2004) спрабавалі дапоўніць сваімі артыкуламі даследчы прабел у 1980-я гг., звярнуўшы ўвагу на новыя паэмы беларускіх аўтараў. Акрамя адлюстравання цэлага комплексу мастацкіх асаблівасцей твораў, у названых навуковых працах была зроблена спроба ўказаць і асноўныя тэндэнцыі развіцця паэмы ў жанравым ракурсе. Гэтая задача ставіцца і ў працах літаратуразнаўцаў А. Бельскага, Н. Пыско, што з’явіліся ўжо ў ХХ ст. У аглядным артыкуле Н. Заяц «Беларуская паэма на сучасным этапе» пры вызначэнні актуальных тэндэнцый упэўнена дэкларуецца: «паэма з’яўляецца адным з найбольш папулярных і шырока прадстаўленых жанраў» [4, с. 99].

На сучасным этапе важкім укладам у даследаванне беларускай паэмы сталі працы Ж. Некрашэвіч-Кароткай, якая абрала аб’ектам вывучэння лацінамоўныя паэмы перыяду Рэнесансу і ранняга Барока. У яе манаграфіях «Беларуская лацінамоўная паэзія: ранні Рэнесанс» (2009) і «Беларуская лацінамоўная паэма: позні Рэнесанс і ранняе Барока» (2011) не толькі ўзнаўляецца значны пласт нацыянальнай літаратуры, але і вывучаецца працэс фарміравання ліра-эпічнай традыцыі ў беларускай літаратуры ад часоў Рэнесансу да ХІХ ст.

Праведзены агляд літаратуразнаўчых прац дазваляе канстатаваць недастатковую актыўнасць навуковага пошуку беларускіх літаратуразнаўцаў і крытыкаў па пытаннях гісторыі, станаўлення, эвалюцыі і перспектывах жанру беларускай паэмы. На жаль, сістэмных тэарэтычных прац па праблеме развіцця паэмы, дзе матэрыялам аналітычнага

вывучэння сталі б творы апошніх дзесяцігоддзяў XX – пачатку XXI ст., у айчынным літаратуразнаўстве не з’явілася.

**Праблема тыпалогіі жанру паэмы ў літаратуразнаўстве**

Нягледзячы на незавершанасць вырашэння пытанняў тыпалогіі паэмы, спробы яе сістэматызацыі сустракаем у самых розных даследаваннях гэтага жанру. Так, у манаграфіі А. Сакалова «Нарысы па гісторыі рускай паэмы XVIII і першай паловы XIX ст.» (1955) паслядоўна разглядаліся асноўныя тыпы рускай паэмы XVIII – першай паловы XIX ст. – рамантычны і рэалістычны.

Пры аглядзе даследчых прац, прысвечаных паэме, выяўляецца дастаткова вялікая колькасць самых розных яе класіфікацый. У манаграфіі М. Зубкова «Руская паэма сярэдзіны XIX ст.» (1967) прапануюцца наступныя жанравыя віды паэмы: ліра-эпічная, лірыка-медытатыўная, сацыяльна-гераічная, рамантычная, рэалістычна-народная, гістарычная, паэма-аповесць, паэма-раман і інш. Даследчык звяртае ўвагу на складанасць стварэння грунтоўнай класіфікацыі паэмы з-за размытасці яе азначэння. Ён падкрэслівае, што для паэмы характэрны ўзвышаны пафас, і ў ёй часцей за ўсё адлюстроўваюцца праблемы агульнанародныя, агульнанацыянальныя. Вучоны ўпэўнены, што неабходна ўлічваць тэматыку твора, спецыфіку развіцця сюжэта, асаблівасці кампазіцыі і іншыя мастацкія адзнакі і ўласцівасці.

І. Неўпакоева ў манаграфіі «Рэвалюцыйна-рамантычная паэма першай паловы XIX ст. Вопыт тыпалогіі жанру» (1971), аналізуючы творы рускіх і еўрапейскіх аўта-раў, вызначае наступныя разнавіднасці жанру паэмы: ліра-эпічная, філасофска-сімвалічная і сатырычная. Да кожнага з тыпаў паэм даследчык адносіць свае відавыя разнавіднасці. Так, да ліра-эпічнай паэмы яна адносіць гімнічную, нацыянальна-гераічную і інш.; у філасофска-сімвалічнай паэме вылучаны трагедыйная, сацыяльна-філасофская, лірыка-сімфанічная; у сатырычнай паэме – памфлетна-сатырычная, сатырычная паэма-фрэска. Натуральна, што наяўнасць такой складанай сістэмы класіфікацыі паэмы вынікае са своеасаблівасці жанру, які дапускае самыя разнастайныя ўтварэнні, абумоўлены ў тым ліку і аўтарскім пафасам. З другога боку, класіфікацыя павінна дакладна адлюстроўваць адзначаныя характарыстыкі, бо інакш яна атрымаецца прыблізнай.

На наш погляд, глыбей у гэтым пытанні разгортваюцца навуковыя пошукі А. Васількоўскага ў кнізе «Жанравыя разнавіднасці рускай савецкай паэмы. 1917–1941 гг. Вопыт тыпалагічнай характарыстыкі» (1979). Гэты даследчык не толькі звяртаеца да новых твораў рускіх аўтараў, але і прапануе ўласную тыпалогію, вылучаючы тры жанравыя віды паэмы: апавядальная, лірычная і кантамінатыўныя. Кожная з іх, у сваю чаргу, падзелена даследчыкам на свае разнавіднасці. Так, у апавядальнай паэме вылучаны два віды – эпіка-апавядальная і лірыка-апавядальная. Лірычная паэма, на думку даследчыка, можа быць абагулена-лірычнай, лірыка-публіцыстычнай, лірыка-медытатыўнай, лірыка-псіхалагічнай. Вылучаюцца таксама драматычная паэма і паэма-стылізацыя. Класіфікуючы паэмы, даследчык кіруецца родавымі крытэрыямі твора, але ў такім выпадку спрэчна выглядае лірыка-апавядальны від паэмы, у якім таксама праяўляюцца рысы розных родавых адзнак, як і ў драматычнай паэме.

У даследаванні беларускага літаратуразнаўцы М. Лазарука «Беларуская паэма другой паловы XIX ст – пачатку XX ст.» (1970) таксама прапануецца класіфікацыя твораў паэмнага жанру: рэалістычная, фальклорная, эпічная, ліра-эпічная, лірычная, паэма-балада, паэма-эпапея, класічная эпапея і інш. У аснову класіфікацыі М. Лазарука пакладзена катэгорыя ўзвышанага, якая, на думку даследчыка, «найшырэй выяўляе эстэтычную прыроду паэмы» [7, с. 12].

У той жа час украінскі даследчык А. Каспрук у артыкуле «Паэма ў сучасным літаратуразнаўстве», падсумоўваючы свае назіранні за прапанаванымі навукоўцамі вары-

янтамі класіфікацыі, слушна сцвярджае: «Зрозуміло, що при визначенні жанрових різновидів поеми не можна ставити глухих бар'єрів, утворювати замкнутих "блоків", оскільки існує історично і жанрово узаконена певна плинність ознак поеми, їх дифузія, перехід одних форм в інші. Отже, при визначенні жанру поеми необхідно керуватися основними ознаками, не ігноруючи, проте, і менш важливих, другорядних, які за певних умов, при оцінці поеми під певним конкретним кутом зору, можуть набувати великого значення» [5, с. 30]. Працягваючы вырашаць праблемы класіфікацыі твораў паэмнага жанру, ён дадае свой пункт гледжання: «І все-таки при всій складності класифікаційного визначення поеми, її конкретного жанрового різновиду доцільно починати з її родових ознак. В першу чергу треба відповісти на питання, яка це поема – епічна, ліро-епічна, лірична, драматична?» [5, с. 30]. Пры гэтым даследчык робіць істотнае ўдакладненне: «Однак встановити жанрово-родовий різновид поеми замало. Класифікуючи поему, дослідник прагне (і цього потребує повнота характеристики) визначити її тематику, ідейно-змістову спрямованість, сюжетну будову, композиційні, стилістично-структурні особливості, творчий метод, яким користувався письменник тощо. Тоді неминуче постають інші характеристи-ки поеми, інші класифікаційні доповнення у визначенні її ідейної та художньо-естетичної сутності» [5, с. 31].

Асэнсоўваючы прыведзеныя прапановы па жанравай класіфікацыі паэмы, можна пагадзіцца са сцвярджэннем Л. Спясіўцавай, што «характарыстыка зместу на ўзроўні міжродавага і міжжанравага ўзаемадзеяння (вылучэнне такіх тыпаў паэмы, як апавядальная, лірычная і кантамінатыўная), прадстаўлена значна вузей, чым своеасаблівасць жанравай формы, якая разглядаецца досыць шырока: і на ўзроўні стылю, і на ўзроўні псіхалагізма, і на ўзроўні мастацкай абагуленасці» [11, с. 155].

М. Арочка таксама прыводзіць тыпы паэмнай формы: апавядальна-аб'ектывізаваная, ліра-маналагічная і драматычна-дыялогавая, якія могуць сустракацца «ў самых розных камбінацыях і ўзаемаперапляценнях» [1, с. 236].

Наступнай спробай даць азначэнне паэме як жанру і стварыць яе тыпалогію стала дысертацыя расійскага даследчыка А. Крупчанава «Жанравая адметнасць сучаснай рускай савецкай паэмы (80-я гг.)». Аўтар прапануе сваё азначэнне жанру: «Паэма – гэты вялікі вершаваны твор з нацыянальна-гістарычнай і/або анталагічнай праблематыкай, асэнсаванай на найбольш высокім узроўні мастацкага абагульнення, які дазваляе засяродзіць увагу на ключавых момантах лёсу асобы і грамадства, што вызначае канструктыўныя асаблівасці такога твора: дамінанту родавай структуры і сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі. Дадзенае азначэнне служыць асновай для стварэння ўнутрыпаэмнай тыпалогіі, у якой вылучаюцца два узроўні – змястоўны (градацыя па тыпу праблематыкі) і фармальны (родавая дамінанта, сюжэтнасць/бессюжэтнасць)» [6]. Аўтар рэкамендуе разглядаць паэму праз спалучанасць родавай дамінанты з яе мастацкай арганізацыяй. Пры гэтым не ўлічаны варыянты паэмы, што ўтварыліся шляхам міжжанравага ўзаемадзеяння і маюць эксперыментальны характар.

У артыкуле А. Бельскага «Беларуская паэма пачатку XXI стагоддзя: жанравая дынаміка, тыпалагічны аспект» не толькі ўзгадваюцца паэмы беларускіх аўтараў новага часу, але і падаецца спроба іх тыпалагізацыі. Аўтар заўважае, што «ў галіне паэмнай творчасці існуе жанрава-відавая разнастайнасць» [3, с. 105], але дакладнай класіфікацыі не прапануе. Корпус тэкстаў беларускіх аўтараў у жанры паэмы даследчык падзяляе толькі на дзве разнавіднасці: «нароўні з традыцыйнымі мадэлямі існуюць індывідуальна-адметныя жанравыя формы паэмных твораў» [3, с. 105]. Думаецца, што для класіфікацыі паэмы неабходна абраць комплексную мадэль крытэрыяў, якія дазволяць аб'яднаць у рэчышчы названага жанру і кананічныя, і некананічныя формы паэмы. Нягледзячы на трансфармацыі, якія адбыліся ў рэчышчы паэмы, яна застаецца тым жанрам, які вызначае пастаянную ўнутраную суаднесенасць са сваімі вытокамі і перадумовамі («па-

мяць жанру»). Гэтая ж «памяць жанру» праяўляецца і ў новых мадыфікацыях паэмы. Важна дакладна вызначыць тую сутнасную жан-равую адзнаку, якая можа прэтэндаваць, па азначэнні С. Бройтмана, на абазначэнне «ўнутранай меры» паэмы як жанру.

Такім чынам, стан сучаснай паэмы можна характарызаваць як зменлівы, дынамічны. Гэта абумоўлена з’яўленнем новых разнавіднасцей жанру, у якіх класічныя рысы размываюцца, дэфармуюцца, што і стварае праблему сістэматызацыі. Узнікненне новага тыпу твораў, сінтэзацыя родавых і жанрава-стылёвых адзнак – устойлівая тэндэнцыя ў сучаснай літаратуры, характэрная і для іншых жанраў. Таму развіццё і функцыянаванне паэмы ў новых літаратурных умовах застаецца важным даследчым напрамкам і актуалізуе патрэбу яе ўнутрыжанравай класіфікацыі.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Арочка, М. М. Беларуская савецкая паэма / М. М. Арочка. – Мінск, 1979. – 336 с.
2. Беларуская літаратура XIX стагоддзя : хрэстаматыя / С. Х. Александровіч, А. А. Лойка, В. П. Рагойша. – Мінск, 1971. – 376 с.
3. Бельскі, А. І. Беларуская паэма пачатку XXI стагоддзя: жанравая дынаміка, тыпалагічны аспект / А. І. Бельскі // У ракурсе сучаснага асэнсавання : міжкаф. зб. навук. пр. – Магілёў, 2014. – Вып. 7. – С. 10–17.
4. Заяц, Н. І. Беларуская паэма на сучасным этапе / Н. І. Заяц // Сучасны літаратурны працэс: тэндэнцыі і праблемы развіцця : дапаможнік / І. М. Гоўзіч [і інш.] ; пад агул. рэд. Т. К. Грамадчанкі. – Мінск : БДПУ, 2010. – С. 25–40.
5. Каспрук, А. А. Поема в сучасному літературознавстві / А. А. Каспрук // Радян. літературознавство. – 1972. – № 5. – С. 29–35.
6. Крупчанов, А. Л. Жанровое своеобразие современной русской советской поэмы (восьмидесятые годы) [Электронный ресурс] : автореф. дис. ... канд. филол. наук / А. Л. Крупчанов. – Режим доступа: http: //cheloveknauka.com/. – Дата доступа: 18.02.2016.
7. Лазарук, М. А. Беларуская паэма ў другой палове XIX – пачатку XX ст. / М. А. Лазарук. – Мінск, 1970. – 270 с.
8. Лазарук, М. А. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў / М. Лазарук, А. Я. Ленсу. – Мінск, 1996. – 176 с.
9. Поэма // Литературная энциклопедия. Словарь литературных терминов : в 2 т. / под ред. Н. Бродского [и др.]. – М. ; Л. : Изд-во Л. Д. Френкель, 1925. – Т. 2. – С. 629–633.
10. Присяжнюк, О. М. Жанр поеми у творчості Д. Павличка : автореф. дис. … канд. філол. наук : 01.01.01 / О. М. Присяжнюк. – Київ : Україн. літ., 2008. – 16 с.
11. Спесивцева, Л. В. Поэма как литературный жанр / Л. В. Спесивцева // Гуманитар. исслед. – 2012. – № 1 (41). – С. 150–156.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 26.10.2018

***Tarasava S.M.*** **The Issue of the Typology of the Poem in Literary Studies and Criticism**

*The article considers the genre of the poem in line with its study by foreign and domestic literary critics. The poem is defined by a number of its stable genre assessments, and at the same time remains a volatile and dynamic genre. Therefore, the issues of studying and creating the typology of the poem remain relevant for modern researchers of this genre.*